Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
________________А. А. Корбут
«_____» ______________2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД - ____/ вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АРКЕСТРАВАЯ І АНСАМБЛЕВАЯ ЛІТАРАТУРА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей*
*1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках),*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць*
*(інструментальная музыка), спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02*
*Інструментальная музыка духавая*

2016

Вучэбная праграма складзена ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйных стандартаў Рэспублікі Беларусь ОСВО 1-18 01 01-2013 Народная творчасць (па напрамках), ОСВО 1-16 01 06-2013 Духавыя інструменты (па напрамках), вучэбных планаў установы вышэйшай адукацыі па напрамках спецыяльнасцей. Рэгістрацыйны № С16-1-07/13 вуч., № С18-1-09/13 вуч.

**СКЛАДАЛЬНІК**
*А. Л. Карацееў,* прафесар кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**:
*А. І. Кавалёў,* дацэнт кафедры музычна-педагагічнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*В. М. Ушакова,* прафесар кафедры псіхалогіі і педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар педагагічных навук, прафесар

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ВУЧЭБНАЙ:**
*кафедрай* духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 11 ад 25.06.2015 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 29.11.2015 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. Л. Карацееў

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Аркестравая і ансамблевая літаратура» з'яўляецца састаўной часткай працэсу падрыхтоўкі студэнтаў спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02 Народная творчасць (інструментальная музыка духавая). Улічваючы тое, што пасля заканчэння вышэйшай установы студэнты гэтай спецыяльнасці будуць працаваць у сферы духавога мастацтва, мэтазгодна такім будучым спецыялістам засвоіць навыкі адбору і выканальніцкага аналізу партытур для ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў.

Вучэбная дысцыпліна «Аркестравая і ансамблевая літаратура» з'яўляецца адной з асноўных музычна-тэарэтычных дысцыплін у працэсе падрыхтоўкі кадраў для музычнага мастацтва, у тым ліку яго разнастайнасці – духавога мастацтва. Усведамленне студэнтамі тэарэтычнага і практычнага матэрыялу па вучэбнай дысцыпліне «Аркестравая і ансамблевая літаратура» цесна звязана з адпаведнымі ведамі па музычна-тэарэтычных і спецыяльных дысцыплінах: «Гісторыя музычнага мастацтва», састаўных частках вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя музыкі», «Аркестравы клас», «Камерна-інструментальны ансамбль», «Прафесійная педагогіка і методыка выкладання спецыяльных дысцыплін», «Чытанне і аналіз аркестравых партытур» і г. д.

Зместам вучэбнай праграмы прадугледжана фарміраванне кампетэнцый.

**Інавацыйна-метадычная дзейнасць**

ПК-20. Ужываць новыя інавацыйныя тэхналогіі навучання, мультымедыйныя тэхналогіі, электронныя падручнікі, фоназапісы.

ПК-21. Удасканальваць методыкі работы з творчымі калектывамі, распрацоўваць вучэбныя праграмы, вучэбна-метадычныя комплексы і іншую вучэбную літаратуру.

ПК-22. Арганізоўваць работу навукова-метадычных канферэнцый па праблемах развіцця народнай творчасці.

**Творчая дзейнасць**

ПК-27. Рабіць уласныя аранжыроўкі, інструментоўкі, апрацоўкі і пералажэнні для харавых калектываў, аркестраў, ансамбляў.

ПК-28. Самастойна падбіраць рэпертуар, фарміраваць канцэртную праграму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-29. Рыхтаваць творчыя выступленні харавых (інструментальных) калектываў і весці канцэртную работу ў рэгіёне і паза яго межамі.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – падрыхтоўка спецыялістаў духавога мастацтва, якія здольны аналізаваць мастацка-выразныя, тэхнічна-выканальніцкія асаблівасці нотных выданняў для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў на лепшых узорах айчыннага і сусветнага музычнага мастацтва. Такі падыход будзе спрыяць фарміраванню ў студэнтаў разглядаемай спецыяльнасці дакладных ведаў аб мастацка-выканальніцкіх магчымасцях, функцыянаванні гэтых мастацкіх калектываў у сучаснай мастацкай культуры.

Асноўныя *задачы вучэбнай дысцыпліны:*

1) атрымаць неабходныя веды аб сістэматызацыі адпаведных партытур для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў з мэтай будучай самастойнай арганізацыі дзейнасці асабістых калектываў ансамбляў ці аркестраў;

2) развіць адпаведныя навыкі падбору партытур для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

3) састаўляць планы самастойнай работы па вывучэнні і засваенні асаблівасцей партытур для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (інструктыўны матэрыял – практыкаванні, гамы; мастацкі матэрыял – творы розных форм);

4) самастойна вызначаць ансамблевыя ці аркестравыя цяжкасці і ажыццявіць адпаведную работу па іх дакладным вывучэнні;

5) ведаць асноўныя нотныя выданні (аркестравая і ансамблевая літаратура для тыпавых, а таксама і нетыпавых саставаў ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў);

6) ажыццяўляць пошукі найбольш эфектыўных канцэртных увасабленняў духавой музыкі для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– класіфікацыю, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія, тэхнічна-выканальніцкія магчымасці, асаблівасці тыпавых саставаў ансамбляў ці аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– сутнасць аркестрава-ансамблевага выканальніцтва і вызначэнне адпаведных выканальніцкіх задач пры аналізе музычных твораў;

– мастацка-творчыя, арганізацыйна-метадычныя асаблівасці партытур для ансамбляў ці аркестраў духавых інструментаў;

– этапы работы па вывучэнні партытур для ансамбляў ці аркестраў духавых інструментаў, усведамленне іх зместу і задач;

– папулярныя зборнікі партытур па арганізацыі заняткаў па аркестрава-ансамблевай падрыхтоўцы для агульнааркестравай рэпетыцыі ці рэпетыцыі з ансамблем;

– сацыякультурныя аспекты канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

*умець:*

– аналізаваць матэрыялы розных тэматычных груп музычных твораў падчас вывучэння партытур для аматарскіх калектываў духавых і ўдарных музычных інструментаў (ансамбль, аркестр);

– ажыццяўляць пошук партытурных выданняў для арганізацыі розных тыпаў рэпетыцыйных заняткаў з рознымі саставамі аматарскіх ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

– вызначаць у партытурах для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў выканальніцкія цяжкасці для ўдзельнікаў той ці іншай інструментальнай групы і магчымай адаптацыі адпаведнага музычнага матэрыялу ў выглядзе пераінструментоўкі неабходных твораў;

– ажыццяўляць аналітычную работу падчас вызначэння партытур для падрыхтоўкі музычных твораў для аматарскіх ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

– ажыццяўляць практычную работу падчас вывучэння партытур з мэтай састаўлення розных варыянтаў планаў работы з вызначаным саставам ансамбля, аркестра духавых і ўдарных інструментаў для правядзення рэпетыцыйных заняткаў з удзельнікамі гэтых калектываў (вызначэнне асобных фрагментаў меладычнага голасавядзення, кантрапункта, умовы адпаведнага транспанавання і неабходнай змены тэсітуры гучання музычнага твора, улік жанрава-стылявых асаблівасцей пры выкананні твораў для ансамбляў ці аркестраў духавых і ўдарных інструментаў, выкананне неабходных карэктур у партытуры і г. д.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*валодаць:*

– аналізам разнастайнасці мастацка-тэматычных груп музычных твораў з улікам сацыяльнай і ўзроставай катэгорыі слухачоў, на якіх разлічана канцэртная праграма;

– навыкамі падбору партытур для розных саставаў ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў з мэтай эфектыўнай арганізацыі рэпетыцыйных заняткаў з удзельнікамі аматарскіх ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

– дакладным афармленнем зместу розных планаў работы з партытурамі для аматарскіх калектываў (ансамбль, аркестр);

– навыкамі комплекснага творча-выканальніцкага аналізу сутнасці разнастайных партытур для розных саставаў ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у адпаведнасці з існуючымі патрабаваннямі арганізацыі сацыякультурнай, музычна-асветніцкай і музычна-эстэтычнай дзейнасці прафесійных і аматарскіх калектываў (ансамбль, аркестр);

– расшыфроўкай існуючай спецыяльнай тэрміналогіі па ансамблевай і аркестравай літаратуры для духавых і ўдарных інструментаў.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Аркестравая і ансамблевая літаратура» ўсяго адведзена 54 гадзіны, з якіх 34 – аўдыторныя (28 – лекцый, 6 – семінарскія). Рэкамендаваная форма кантролю – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Асноўная мэта вучэбнай дысцыпліны «Аркестравая і ансамблевая літаратура». Роля музычна-тэарэтычных і творча-практычных асаблівасцей аркестравай літаратуры ў прафесійнай падрыхтоўцы будучых кіраўнікоў аматарскіх мастацкіх ансамблевых, аркестравых калектываў духавых і ўдарных інструментаў. Вучэбная дысцыпліна «Аркестравая і ансамблевая літаратура» як галіна спецыяльных музычна-тэарэтычных ведаў, практычна-творчых навыкаў і ўменняў. Асноўныя задачы і змест дысцыпліны. Асноўныя патрабаванні да семінарскіх заняткаў, формы бягучага і выніковага кантролю ведаў па дысцыпліне «Аркестравая і ансамблевая літаратура». Месца вучэбнай дысцыпліны «Аркестравая і ансамблевая літаратура» ў падрыхтоўцы кіраўнікоў аматарскіх духавых ансамблевых, аркестравых калектываў на сучасным этапе развіцця нацыянальнай і сусветнай мастацкай культуры і духавога мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 1. Тэрміналогія курса «Аркестравая і ансамблевая літаратура», сувязь з іншымі навукамі і дысцыплінамі*

Сутнасць тэрміна «аркестравая і ансамблевая літаратура» і яго параўнальны аналіз з тэрмінам «партытура музычнага твора». Вызначэнне тэрміна «аркестравая і ансамблевая літаратура». Гісторыя ўдасканалення афармлення партытур для духавых аркестраў. Сувязь і ўзаемаабумоўленасць вучэбнай дысцыпліны «Аркестравая і ансамблевая літаратура» з іншымі музычна-тэарэтычнымі вучэбнымі дысцыплінамі: «Гісторыя музычнага мастацтва», «Тэорыя музыкі», «Аркестравы клас», «Камерна-інструментальны ансамбль», «Прафесійная педагогіка і методыка выкладання спецыяльных дысцыплін», «Методыка работы з ансамблем і аркестрам духавых інструментаў», «Чытанне аркестравых партытур» і г. д.

### *Тэма 2. Асноўныя разнастайнасці партытур для выканальніцкіх форм творчай дзейнасці ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў*

Тыпавыя выканальніцкія формы, у якіх выкарыстоўваюцца тэматычныя партытуры для духавых і ўдарных інструментаў.

Спецыфіка ўключэння гэтых партытур для духавых і ўдарных інструментаў у сучасную выканальніцкую практыку (сольнае выкананне; ансамблевае выкананне; аркестравае выкананне).

Тэматычныя зборнікі музычных твораў для розных складаў ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў («Іграюць салісты», «Танцавальная музыка для духавых аркестраў», «Папулярныя творы для духавых аркестраў», «Творы беларускіх кампазітараў для брас-квінтэта» і г. д.).

*Тэма 3. Спецыяльная літаратура аб асаблівасці інтанавання на духавых інструментах у складзе ансамбля, аркестра*

Аналітычны агляд спецыяльных выданняў па праблемах інтанавання на духавых інструментах (метадычныя рэкамендацыі, метадычныя дапаможнікі, зборнікі навуковых прац вядучых спецыялістаў духавога мастацтва і г. д.).

Засваенне неабходных ведаў аб асаблівасці інтанавання на духавых інструментах у складзе ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

*Тэма 4. Сутнасць работы з інструментамі, якія транспануюць у працэсе аналізу партытур для аркестраў духавых і ўдарных інструментаў*

Вызначэнне тэрмінаў «транспазіцыя» і «транспанаванне». Прынцып класіфікацыі транспануючых інструментаў (асаблівасці тэсітуры гучання). Паняцце «строй інструмента» і яго разнастайнасці.

Вызначэнне асаблівасці натацыі ў аркестравых партытурах і партыях інструментаў, якія транспануюць.

Аналіз выкладання музычнага матэрыялу для інструментаў, якія транспануюць, падчас вывучэння партытур для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

*Тэма 5. Сутнасць музычнага матэрыялу для групы лабіяльных інструментаў у працэсе аналізу партытур для аркестраў духавых і ўдарных інструментаў*

Група лабіяльных інструментаў і іх функцыянальнае выкарыстанне ў складзе ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сутнасць строю, натацыі, дыяпазону гучання, функцыянальнай спецыфікі, характарыстыкі мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей лабіяльных духавых інструментаў і іх вызначэнне ў партытурах для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў (флейта-пікала, флейта-сапрана, флейта-альт, флейта-бас).

Спецыфіка работы з музычным матэрыялам для групы лабіяльных інструментаў падчас вывучэння партытур для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

### *Тэма 6. Сутнасць музычнага матэрыялу для групы язычковых інструментаў у працэсе аналізу партытур для аркестраў духавых і ўдарных інструментаў*

Група язычковых інструментаў і іх функцыянальнае выкарыстанне ў складзе ансамбля (аднайменны, роднасны, змешаны).

Выкарыстанне язычковых інструментаў у партытурах для аркестра духавых інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны). Сутнасць строю, натацыі, дыяпазону гучання, функцыянальнай спецыфікі, характарыстыкі мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей язычковых духавых інструментаў і іх вызначэнне ў партытурах для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў (габой, англійскі ражок, кларнет-пікала in Es, кларнет-сапрана in B, кларнет-сапрана in A, кларнет-бас in B, фагот).

Спецыфіка работы з музычным матэрыялам для групы язычковых інструментаў падчас вывучэння партытур для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

### *Тэма 7. Сутнасць музычнага матэрыялу для групы саксафонаў у працэсе аналізу партытур для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў*

Група саксафонаў і іх функцыянальнае выкарыстанне ў складзе ансамбля (аднайменны, роднасны, змешаны).

Выкарыстанне групы саксафонаў у партытурах для аркестра духавых інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны).

Сутнасць строю, натацыі, дыяпазону гучання, функцыянальнай спецыфікі, характарыстыкі мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей групы саксафонаў і іх вызначэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў партытурах для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў (саксафон-сапраніна in Es, саксафон-сапрана in B, саксафон-альт in Es, саксафон-тэнар in B, саксафон-барытон in Es і інш.).

Спецыфіка работы з музычным матэрыялам для групы саксафонаў падчас вывучэння партытур для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

*Тэма 8. Сутнасць музычнага матэрыялу для групы характарных інструментаў у працэсе аналізу партытур для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў*

Група характарных інструментаў і іх функцыянальнае выкарыстанне ў складзе ансамбля (аднайменны, роднасны, змешаны).

Выкарыстанне групы характарных інструментаў у партытурах для аркестра духавых і ўдарных інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны).

Сутнасць строю, натацыі, дыяпазону гучання, функцыянальнай спецыфікі, характарыстыкі мастацка-выразных і тэхнічнавыканальніцкіх асаблівасцей групы характарных інструментаў і іх вызначэнне ў партытурах для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў (валторна in Es, валторна in F; труба in B; трамбон in B).

Спецыфіка работы з музычным матэрыялам для групы характарных інструментаў падчас вывучэння партытур для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

*Тэма 9. Сутнасць музычнага матэрыялу для групы ўдарных інструментаў і эпізадычных інструментаў у працэсе аналізу партытур для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў*

Група ўдарных інструментаў і іх функцыянальнае выкарыстанне ў складзе ансамбля (аднайменны, роднасны, змешаны).

Выкарыстанне групы ўдарных інструментаў у партытурах для аркестра духавых інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны).

Сутнасць натацыі, дыяпазону гучання, функцыянальнай спецыфікі, характарыстыкі мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей групы ўдарных інструментаў і іх вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значэнне ў партытурах для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

Спецыфіка работы з музычным матэрыялам для групы ўдарных інструментаў падчас вывучэння партытур для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

Разнастайнасць эпізадычных інструментаў, у тым ліку – беларускіх народных духавых інструментаў, якія найбольш часцей выкарыстоўваюцца ў ансамблях ці аркестрах духавых і ўдарных інструментаў. Натацыя, дыяпазон гучання, функцыянальная спецыфіка, характарыстыка мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей эпізадычных інструментаў у партытурах для аркестра духавых інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны).

Спецыфіка работы з музычным матэрыялам для эпізадычных інструментаў падчас вывучэння партытур для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

### *Тэма 10. Сутнасць музычнага матэрыялу для групы асноўных амбушурных медных духавых інструментаў у працэсе аналізу партытур для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў*

Група асноўных амбушурных медных духавых інструментаў і іх функцыянальнае выкарыстанне ў складзе ансамбля (аднайменны, роднасны, змешаны).

Выкарыстанне групы асноўных амбушурных медных духавых інструментаў у партытурах для аркестра духавых і ўдарных інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны).

Сутнасць строю, натацыі, дыяпазону гучання, функцыянальнай спецыфікі, характарыстыкі мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей групы асноўных амбушурных медных духавых інструментаў і іх вызначэнне ў партытурах для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў (карнет-сапраніна in Es, карнет-сапрана in B; альтгорн in Es, тэнар-горн in B, барытон-горн in B, эуфоніум in B, туба in Es, туба in B).

Спецыфіка работы з музычным матэрыялам для групы асноўных амбушурных медных духавых інструментаў падчас вывучэння партытур для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 11. Сутнасць музычнага матэрыялу для асноўных відаў канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў*

Вызначэнне, тыпалогія, функцыянальныя, мастацка-выканальніцкія асаблівасці музычнага матэрыялу ў партытурах для ансамбляў духавых і ўдарных інструментаў (аднайменны, роднасны, змешаны) і іх выкарыстанне ў асноўных відах канцэртна-выканальніцкай дзейнасці (дывертысментныя, тэматычныя, манатэматычныя, юбілейныя і іншыя разнастайнасці канцэртных выступленняў).

Вызначэнне, тыпалогія, функцыянальныя, мастацка-выканальніцкія асаблівасці музычнага матэрыялу ў партытурах для аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны) і іх выкарыстанне ў асноўных відах канцэртна-выканальніцкай дзейнасці (дывертысментныя, тэматычныя, манатэматычныя, юбілейныя і іншыя разнастайнасці канцэртных выступленняў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ: дзённая форма атрымання адукацыі

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Кіруемая самастойная работа | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі | | |
| ***Уводзіны*** | 2 | | | |
| *Тэма 1.* Тэрміналогія курса «Аркестравая і ансамблевая літаратура», сувязь з іншымі навукамі і дысцыплінамі | 2 | | | |
| *Тэма 2.* Асноўныя разнастайнасці партытур для выканальніцкіх форм творчай дзейнасці ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў | 2 | 1 | 0,5 | тэст |
| *Тэма 3.* Спецыяльная літаратура аб асаблівасці інтанавання на духавых інструментах у складзе ансамбля, аркестра | 2 | | 0,5 | тэст |
| *Тэма 4.* Сутнасць работы з інструментамі, якія транспануюць у працэсе аналізу партытур для аркестраў духавых і ўдарных інструментаў | 2 | | 0,5 | франтальнае апытанне |
| *Тэма 5.* Сутнасць музычнага матэрыялу для групы лабіяльных інструментаў у працэсе аналізу партытур для аркестраў духавых і ўдарных інструментаў | 2 | 0,5 | 0,5 | тэст |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| *Тэма 6.* Сутнасць музычнага матэрыялу для групы язычковых інструментаў у працэсе аналізу партытур для аркестраў духавых і ўдарных інструментаў | 2 | 0,5 | 0,5 | франтальнае апытанне |
| *Тэма 7.* Сутнасць музычнага матэрыялу для групы саксафонаў у працэсе аналізу партытур для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў | 2 | 0,5 | 0,5 | практыкаванні |
| *Тэма 8.* Сутнасць музычнага матэрыялу для групы характарных інструментаў у працэсе аналізу партытур для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў | 2 | 0,5 | 0,5 | практыкаванні |
| *Тэма 9.* Сутнасць музычнага матэрыялу для групы ўдарных і эпізадычных інструментаў у працэсе аналізу партытур для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў | 2 | 0,5 | 0,5 | франтальнае апытанне |
| *Тэма 10.* Сутнасць музычнага матэрыялу для групы асноўных амбушурных медных духавых інструментаў у працэсе аналізу партытур для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў | 2 | 0,5 | 1 | |
| *Тэма 11.* Сутнасць музычнага матэрыялу для асноўных відаў канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў | 6 | 2 | 1 | франтальнае апытанне |
| **Усяго…** | **28** | **6** | **6** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Ансамблевае выканаўства : вучэб. прагр. для выш. навуч. установ па спецыяльнасці 16 01 06 11 – «духавыя інструменты (народныя)» [Рэкамендавана ў якасці тыпавой] / склад. : А. Л. Карацееў, А. А. Караткевіч, І. А. Мангушаў. – Мінск : БДУ культуры, 2003. – 22 с.

*2. Гром, У. М.* Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. : у 2 ч. / У. М. Гром, А. Я. Крамко, І. А. Мангушаў. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 1. Сольнае выкананне. – 259 с.

*3. Гром, У. М.* Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. : у 2 ч. / У. М. Гром, А. Я. Крамко, І. А. Мангушаў. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 2. Ансамблевае выкананне. – 217 с.

*4. Гром, У. М.* Заіграйце, музыкі!: рэпертуар. зб. для фальклорных калектываў : у 2 ч. / У. М. Гром. – Мінск : Чатыры чвэрці, 1998. – Ч. 2. – 155 с.

*5. Гром, У. М.* Дударэньку-гаспадэньку: рэпертуар. зб. для аматараў ігры на дудзе / У. М. Гром ; БелІПК. – Мінск, 1999. – 54 с.

*6. Коротеев, А. Л.* Генезис образования специалистов духового исполнительского искусства Беларуси (народно-инструментального, профессионального и любительского) / А. Л. Коротеев // Музыкальное искусство и музыкальное образование на рубеже веков: материалы научных конференций «Беларусь и музыкальное наследие XX столетия: поиски и обретения», 29–30 нояб. 2001 г., Минск, «Музыкальное образование в контексте художественной культуры», 10–11 дек. 2002 г., Минск. – Вып. 1. – Минск : Белорус. гос. акад. музыки, 2004. – С. 138–146.

*7. Коротеев, А.Л.* Педагогическая и жанрово-тематическая направленность оркестровой и ансамблевой литературы в системе подготовки специалистов духового искусства Беларуси (профессиональные и любительские коллективы) / А. Л. Коротеев // Современные направления теоретических и прикладных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

исследований – 2010: сб. науч. трудов по материалам Междунар. науч.-практ. конф. / Науч.-исслед. проектно-конструкторский ин-т морского флота Украины, Одесский нац. морской ун-т, Украинская гос. акад. железнодорожного транспорта, 15–26 марта 2010 г. – Одесса, 2010. – Т. 27 «Искусствоведение, архитектура и строительство». – С. 65–71.

8. *Коротеев, А. Л.* Фольклорные духовые инструменты белорусов в этнокультурном воспитании и художественном образовании детей и молодежи (от музыкальной игрушки до разнообразия национального инструментария) / А. Л. Коротеев // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання): зб. навук. арт. / склад. і навук. рэд. І. І. Сучкоў. – Мінск : Бестпринт, 2004. – С. 87–94.

9. *Карацееў, А. Л.* Забеспячэнне працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў у ВНУ культуры і мастацтваў Беларусі (вучэбна-метадычныя і арганізацыйныя аспекты) / А. Л. Карацееў // Кафедра як асноўны цэнтр падрыхтоўкі спецыялістаў да дзейнасці ў сацыякультурнай і інфармацыйна-камунікатыўнай сферах : матэрыялы навук.-метад. канф., Мінск, 19–20 лют. 2004 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 51–54.

10. *Карацееў, А. Л.* Роля прагрэсіўных тэхналогій падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва ў працэсе распрацоўкі сучасных адукацыйных стандартаў / А. Л. Карацееў // Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты : матэрыялы навук.-метад. канф., Мінск, 2–3 лют. 1999 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – С. 91–96.

11. *Назина, И. Д.* Белорусские народные музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые / И. Д. Назина ; под ред. М. Я. Гринблат. – Минск : Наука и техника, 1979. – 144 с.

12. *Назіна, І. Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Д. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с.

13. *Скорабагатаў, В.* Зайгралі спадчынныя куранты: цыкл нарысаў з гісторыі праф. муз. культуры Беларусі / В. Скорабагатаў. – Мінск : Тэхналогія, 1998. – 180 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

1. *Коротеев, А. Л.* Бытование амбушюрных духовых музыкальных инструментов в Беларуси (по материалам археологических изысканий, архивных исследований и анализа печатных изданий в контексте славянской органологии) / А. Л. Коротеев // IV Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славянскага пісьменства і культуры: матэрыялы чытанняў, Мінск, 24–26 мая 1998 г. : у 2 ч. / ЕДУ, Беларус. ун-т культуры ; рэдкал.: А. У. Пазнякоў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – Ч. 2. – С. 168–176.

2. *Коротеев, А. Л.* Духовое искусство Беларуси: жанрово-стилистические поиски и перспективы развития / А. Л. Коротеев // Музыкальное творчество и XXI век: традиции, новации и перспективы : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 21 апр. 2000 г. – Минск : Технопринт, 2000. – С. 41–45.

3. *Коротеев, А. Л.* Функциональные и этноорганологические особенности белорусских народных духовых инструментов / А. Л. Коротеев // X Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славянскага пісьменства і культуры, Мінск, 24–26 мая 2004 г. / рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 66–72.

4. *Карацееў, А. Л.* Неардынарная з'ява нацыянальна-выканальніцкага адраджэння / А. Л. Карацееў // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2005. – № 5. – С. 119–122.

5. *Константинов, И.* Приходите слушать канклес / И. Константинов // Наука и жизнь. – 1989. – № 6. – С. 111–113.

6. *Логвін, В.* Традиціі інструментального виконавства в чеських поселеннях Волині / В. Логвін // Украіньска культура в іменах і дослідженнях: наукові записки Рівненьского державного інституту культури. – Рівне : Рівненський державний інститут культури, 1977. – Віп. 1. Волинске Полісся в контексти слов'янськоі культури. – С. 133–134.

7. Народные музыкальные инструменты и инструментальная музыка: сб. ст. и материалов: в 2 ч. / сост. И. В. Мациевский; под общ. ред. Е. В. Гиппиуса. – М. : Сов. композитор, 1987. – Ч. 1. – 264 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*8.* Народные музыкальные инструменты и инструментальная музыка: сб. ст. и материалов: в 2 ч. / сост. И. В. Мациевский ; под общ. ред. Е. В. Гиппиуса. – М. : Сов. композитор, 1988. – Ч. 2. – 327 с.

*9. Хоткевич, Г.* Музичні інструменти українського народу / Г. Хоткевич ; упоряд., підг. тексту, покажч. О. О. Савчук ; післямови І. В. Мацієвського, В. Ю. Мішалова, М. Й. Хая. – Друга редакція. – Харків : Видавець Савчук О. О., 2012. – 512 с. ; 202 іл. – (Серія «Слобожанський світ». Випуск 4).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па вучэбнай дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах вучэбнай дысцыпліны;

– састаўленне варыянтаў індывідуальнага плана работы над музычнымі творамі кіраўніка ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў;

– састаўленне варыянтаў індывідуальных планаў студэнтаў па засваенні спецыфікі партытур музычных твораў для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах вучэбнай дысцыпліны;

– франтальнае вуснае апытанне студэнтаў на занятках па тэмах вучэбнай дысцыпліны.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

З мэтай засваення матэрыялаў вучэбнай дысцыпліны «Аркестравая і ансамблевая літаратура» студэнтам для ажыццяўлення самастойнай падрыхтоўкі прапануецца звярнуць увагу на наступныя пытанні:

1) скласці табліцу, якая адлюстроўвае асноўныя віды аркестравай літаратуры для розных саставаў аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (вучэбная, канцэртная, арыгінальная, адаптаваная);

2) напісаць характарыстыкі розных саставаў аркестра духавых і ўдарных інструментаў і прывесці прыклады найбольш вядомых музычных твораў для гэтых саставаў;

3) адзначыць асноўныя жанрава-тэматычныя групы аркестравай літаратуры;

4) скласці спіс сусветна вядомых класічных твораў аркестравай літаратуры для аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5) скласці спіс сучасных твораў аркестравай літаратуры для аркестраў духавых і ўдарных інструментаў;

6) пералічыць творы беларускіх аўтараў для аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (тыражаваныя выданні; інструментоўкі вядомых аўтараў);

7) вызначыць асаблівасці размеркавання галасоў у аркестры духавых і ўдарных інструментаў з улікам іх нотаграфічнага афармлення ў сучасных партытурах (асноўныя і эпізадычныя інструменты, у тым ліку – беларускія народныя духавыя інструменты).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падчас падрыхтоўкі матэрыялаў па вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Аркестравая і ансамблевая літаратура» студэнт павінен улічваць наступныя патрабаванні:

I. Для выканання таго ці іншага аб'ёму заданняў па адпаведным пытанні вучэбнай дысцыпліны запланаваць пералік асноўных пытанняў.

Прыклад. *Тэма* – «Від мастацкай літаратуры для аркестраў духавых і ўдарных інструментаў», *пытанні*:

*а)* асноўныя мастацка-тэматычныя прынцыпы класіфікацыі аркестравай літаратуры для розных саставаў аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (малы медны, вялікі медны, малы змешаны, вялікі змешаны);

*б)* асаблівасці фарміравання вучэбнай аркестравай літаратуры для розных саставаў аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (малы медны, вялікі медны, малы змешаны, вялікі змешаны);

*в)* асаблівасці фарміравання канцэртнай аркестравай літаратуры для розных саставаў аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (малы медны, вялікі медны, малы змешаны, вялікі змешаны);

*г)* асаблівасці фарміравання арыгінальнай аркестравай літаратуры для розных саставаў аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (малы медны, вялікі медны, малы змешаны, вялікі змешаны);

*д)* асаблівасці фарміравання адаптаванай аркестравай літаратуры для розных саставаў аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (малы медны, вялікі медны, малы змешаны, вялікі змешаны);

*е)* выкарыстанне дадатковых клавішных і ўдарных інструментаў, партыі якіх адзначаны ў джазавых і эстрадных творах.

II. З мэтай вывучэння аркестравых партытур для розных саставаў аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (малы медны, вялікі медны, малы змешаны, вялікі змешаны), вывучэння дакладных характарыстык гучання духавых і ўдарных музычных інструментаў самастойна падрыхтаваць для праслухоўвання неабходныя фанаграмы музычных запісаў.

III. З мэтай атрымання неабходных музычна-тэарэтычных, гістарычных ведаў па дысцыпліне «Аркестравая і ансамблевая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літаратура» звяртацца да вывучэння адпаведных матэрыялаў, якія адлюстраваны ў спецыяльных выданнях (партытуры, манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, метадычныя рэкамендацыі і г. д.).

IV. Выконваць неабходныя практыкаванні па вывучэнні адпаведных партытур для розных саставаў аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (малы медны, вялікі медны, малы змешаны, вялікі змешаны).

V. Удасканальваць тэхніку чытання партытур для розных саставаў аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (малы медны, вялікі медны, малы змешаны, вялікі змешаны), падчас якога вызначаць неабходныя групы інструментаў, даваць характарыстыку гучання асобным інструментам, вызначаць інструменты, якія транспануюць і вызначаць іх рэальнае гучанне па музыцы (in C).

VI. Скласці адпаведны спіс розных відаў аркестравай літаратуры (па выбары) для розных саставаў аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (малы медны, вялікі медны, малы змешаны, вялікі змешаны).

## Кантрольныя пытанні для самаправеркі студэнтаў

З мэтай засваення матэрыялу вучэбнай дысцыпліны «Аркестравая і ансамблевая літаратура» студэнтам для ажыццяўлення самастойнай падрыхтоўкі прапануюцца наступныя пытанні:

1. Мэта, змест, задачы вучэбнай дысцыпліны «Аркестравая і ансамблевая літаратура».
2. Месца вучэбнай дысцыпліны «Аркестравая і ансамблевая літаратура» ў падрыхтоўцы кіраўнікоў аматарскіх духавых аркестравых калектываў.
3. Гістарычныя аспекты фарміравання аркестравай і ансамблевай літаратуры для ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных музычных інструментаў.
4. Сувязь вучэбнай дысцыпліны «Аркестравая і ансамблевая літаратура» з іншымі навукамі і дысцыплінамі і іх пералік з неабходнымі тлумачэннямі.
5. Асноўная тэрміналогія вучэбнай дысцыпліны «Аркестравая і ансамблевая літаратура» і яе змест.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Асноўныя тэарэтычныя пытанні (сутнасць ансамблевай, аркестравай літаратуры і яе разнастайнасці, параўнальны аналіз партытур для арганізацыі канцэртна-выканальніцкай дзейнасці прафесійных і аматарскіх ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў і г. д.).

7. Асноўныя практычныя пытанні (вызначэнне сутнасці таго ці іншага твора для аматарскага аркестра духавых і ўдарных інструментаў; спецыфіка падбору музычных твораў; аналіз спецыфікі мастацка-выразнай і тэхнічна-выканальніцкай характарыстыкі твораў у партытуры для ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў і г. д.).

8. Пералік асноўных саставаў ансамбляў духавых і ўдарных музычных інструментаў з прыкладамі асобных твораў і тэматычных нотных зборнікаў.

9. Пералік асноўных саставаў аркестраў духавых і ўдарных музычных інструментаў з прыкладамі асобных твораў і тэматычных нотных зборнікаў.

10. Асаблівасці папулярызацыі твораў для ансамбляў у творчай дзейнасці асноўных саставаў ансамбляў духавых і ўдарных музычных інструментаў.

11. Асаблівасці папулярызацыі твораў для аркестраў у творчай дзейнасці асноўных саставаў аркестраў духавых і ўдарных музычных інструментаў.

12. Асноўныя віды і асаблівасці рэпетыцыйнай работы па вывучэнні ансамблевай літаратуры для асноўных саставаў ансамбляў духавых і ўдарных музычных інструментаў.

13. Асноўныя віды і асаблівасці рэпетыцыйнай работы па вывучэнні аркестравай літаратуры для асноўных саставаў аркестраў духавых і ўдарных музычных інструментаў.

14. Праблема фарміравання ансамблевай і аркестравай літаратуры для аматарскіх калектываў духавых і ўдарных музычных інструментаў (ансамбль, аркестр).

15. Ансамблевая і аркестравая літаратура ў канцэртна-выканальніцкай дзейнасці калектываў духавых і ўдарных музычных інструментаў (ансамбль, аркестр).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# АРКЕСТРАВАЯ І АНСАМБЛЕВАЯ ЛІТАРАТУРА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей*
*1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках),*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць*
*(інструментальная музыка), спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02*
*Інструментальная музыка духавая*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 0,89. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ